# Весці БДПУ

**Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.**
**Выдаецца з чэрвеня 1994 г.**

**№ 2(52) 2007**

**СЕРЫЯ 2.**
**Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія.**
**Эканоміка. Культуралогія**

## Змест

***Галоўны рэдактар:***
**П. Дз. Кухарчык**

***Рэдакцыйная калегія:***
Н. Г. Алоўнікава
А. І. Андарала
(*нам. галоўнага рэдактара*)
У. В. Амелькін
В. А. Бондар
М. К. Буза
В. В. Бушчык
(*нам. галоўнага рэдактара*)
Ю. А. Быкадораў
(*нам. галоўнага рэдактара*)
І. В. Бялько
А. М. Вітчанка
С. Я. Гайдукевіч
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
В. М. Дабранскі
Л. М. Давыдзенка
А. В. Данільчанка
М. М. Забаўскі
В. Б. Кадацкі
Я. Л. Каламінскі
У. М. Калюноў
Л. В. Камлюк
Л. А. Кандыбовіч
І. В. Катляроў
П. В. Кікель
Г. А. Космач
У. М. Котаў
Н. І. Кунгурава
М. В. Лазаковіч
І. Я. Левяш
М. І. Лістапад
А. М. Люты
У. А. Мельнік
І. А. Новік
В. М. Русак
А. І. Смолік
В. Дз. Старычонак
В. Б. Таранчук
А. І. Таўгень
І. С. Ташлыкоў
В. М. Фамін
А. Т. Федарук
А. С. Цернавы
Л. Н. Ціханаў
І. І. Цыркун
М. Г. Ясавееў

### *Гісторыя*

*Елізараў С.А.* Тэрыторыя і адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне ССРБ у 1919 г. .......... 3

*Даніловіч В.В.* Моладзь у грамадска-палітычным жыцці ССРБ у 1922 г. .......... 8

*Цуба М.В.* Кірункі грамадска-палітычнай працы некаторых яўрэйскіх арганізацый у Беларусі падчас Першай сусветнай вайны (1914 – люты 1917 гг.) .......... 13

*Раюк А.Р.* Нефармальная структура беларускага грамадства ў XVIII – першай палове XIX ст. .......... 15

*Барадзіна М.С.* Змяненне курсу развіцця пачатковай школы ў Беларусі ў 1863–1865 гг. .......... 19

*Кудраўцава С.А.* Да пытання аб ролі язычніцтва ў грамадска-палітычнай сістэме раннедзяржаўнай Беларусі .......... 23

*Мячыкава І.І.* Індаеўрапейскі міжкультурны генезіс сімвальных знакаў усходнеславянскага архітэктурнага дэкору .......... 27

*Малюгін А.І.*, *Кавяка І.І.* Культ Гора Бехдэцкага: да пытання аб месцы зараджэння .......... 31

*Столяр Дз.М.* Дзейнасць спецыяльных атрадаў і груп па арганізацыі і развіцці партызанскага руху на тэрыторыі Баранавіцкай вобласці .......... 34

*Варывончык І.В.* Сярэдні клас у палітыцы адміністрацыі Б. Клінтана .......... 38

*Старычонак В.В.* Адміністрацыя Б. Клінтана, Кангрэс, грамадская думка і ўдзел ЗША ва ўрэгуляванні баснійскага крызісу (1992–1995 гг.) .......... 42

*Кушнер Н.В.* Суфражысцкі рух у ЗША (1848–1920): узнікненне, станаўленне, развіццё .......... 47

*Субоцін А.Г.* Тэрытарыяльная рэформа рэйха як аб’ект федэратыўнай дыскусіі ў гады Веймарскай рэспублікі .......... 51

### *Філасофія*

*Кхамліш Кхалід.* Сучасная сацыяльна-філасофская і палітычная думка Усходу аб узаемаадносінах з заходняй цывілізацыяй .......... 56

*Красюк У.Ф.* Сістэмная арганізацыя матэрыі: аналіз анталагічных дыспазіцый .......... 60

### *Паліталогія*

*Клачко П.А.* Палітычная сацыялізацыя і асаблівасці дзейнасці моладзі ў палітычным асяроддзі .......... 64

*Касцючкоў А.М.* Палітычны імідж: паняцце, прыметы, віды .......... 67

*Пузыроў Дз.А.* Уплыў рэлігіі на развіццё сістэмы міжнародных зносін .......... 71

***Адрас рэдакцыі:***
220007, Мінск,
вул. Магілёўская, 37,
пакой 124,
тэл. 219-78-12
*e-mail*: vesti@bspu.unibel.by

Пасведчанне № 2288
ад 08.02.05.
Міністэрства інфармацыі
Рэспублікі Беларусь

Падпісана ў друк 15.06.07
Фармат 60×84 1/8.
Папера афсетная.
Гарнітура *Арыял*.
Друк Riso.
Ум. друк. арк. 12,79.
Ул.-выд. арк. 13,72.
Тыраж 100 экз.
Заказ 278.

*Выдавец*
*і паліграфічнае выкананне:*
Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны
педагагічны універсітэт
імя Максіма Танка».
Ліцэнзія № 02330/0133496
ад 01.04.04.
Ліцэнзія № 02330/0131508
ад 30.04.04.
220050, Мінск, Савецкая, 18.
*e-mail*: izdat@bspu.unibel.by

*За дакладнасць прыведзеных у публікацыях фактаў і цытат адказнасць нясуць аўтары*

*Адказны сакратар*
Л. М. Каранеўская

*Рэдактар*
Л. М. Каранеўская

*Тэхнічнае рэдагаванне*
І. І. Галіцкага

*Камп'ютэрная вёрстка*
І. І. Галіцкага

© Весці БДПУ, 2007. № 2. Серыя 2

***Сацыялогія***

*Фурсава Н.У.* Талерантнасць у сістэме каштоўнасна-мэтавых прыярытэтаў выхавання моладзі ва ўмовах вышэйшай школы .................. 75

*Таранава К.Г.* Карпаратыўная культура арганізацыі як індыкатар яе інавацыйнага патэнцыялу .................................................................. 78

*Адамчык К.М.* Устойлівае развіццё турызму ў Рэспубліцы Беларусь як актуальная сацыяльныя праблема.................................................... 82

***Эканоміка***

*Давыдзенка Л.М.*, *Давыдзенка Т.Дз.* Мадэлі прагнозу сацыяльнай сістэмы абароны насельніцтва як прыём фарміравання актыўнай жыццёвай пазіцыі студэнтаў ..................................................................... 86

*Кавальчук В.С.* Эканоміка-прававыя аспекты інтэлектуальнай уласнасці ............................................................................................ 92

***Культуралогія***

*Левяш І.Я.* Вытокі культуратворчасці ................................................. 98

*Кедрык Т.В.* Дыстанцыя ў практыках візуалізацыі Рэнесансу і Новага часу ..........................................................................................103

***Рэфераты***.................................................................................108

УДК 947.6(= 411.16) "1914/1916"

*М.В. Цуба*

# КІРУНКІ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЙ ПРАЦЫ НЕКАТОРЫХ ЯЎРЭЙСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ У БЕЛАРУСІ ПАДЧАС ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (1914 – ЛЮТЫ 1917 г.)

Істотна ўплывалі на грамадска-палітычнае жыццё ў гады Першай сусветнай вайны на беларускіх землях Яўрэйская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя (Паалей-Цыён), сіяністыцка-сацыялістычная рабочая партыя (СС) і Сацыялістычная яўрэйская рабочая партыя (Сярп). У адрозненне ад Бунда гэтыя партыі адным з сваіх асноўных праграмных палажэнняў лічылі тэрытарыялізм, г. зн. імкненне да набыцця ўласнай тэрыторыі для яўрэйскага народа. Бунд лічыў тэрытарыялізм недасягальнай утопіяй, даказваючы, што радзіма яўрэяў там, дзе яны жывуць. Аднак гэты доказ Бунда гісторыя абвергла. Тым не менш, Бунд, у тым ліку і падчас вайны, зусім правільна крытыкаваў іншыя яўрэйская партыі за іх жаданне парваць з культурнымі традыцыямі і духоўнымі каштоўнасцямі яўрэйскага народа.

Даволі дзейснай у гады Першай сусветнай вайны была грамадска-палітычная праца партыі Паалей-Цыён, якая (падобна бундаўскім арганізацыям) у ваенны час стаяла на абарончых пазіцыях. Галоўнай справай сваёй дзейнасці яна абвясціла сіяністыцкую ідэю «асобнага шляху яўрэйскага народа» і таму выступала за стварэнне «асобнага яўрэйскага сацыялістычнага грамадства» ў Палесціне. Разам з тым патрэбна адзначыць, што дадзеная партыя вяла барацьбу за хутчэйшае заключэнне міру і падтрымлівала ідэю «самавызначэння народаў».

Дарэчы, амаль усе гэтыя кірункі дзейнасці Яўрэйскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі былі выкладзены ў праграмных дакументах канферэнцыі Паалей-Цыёна, якая адбылася ў пачатку 1917 г. у Петраградзе. Працягваючы паслядоўную пазіцыю, занятую партыяй у адносінах да Першай сусветнай вайны, на падобных канферэнцыях у Пінску (сакавік 1915 г. ) і Маскве (май 1916 г.) вышэйадзначаная канферэнцыя ў сваёй рэзалюцыі ў інтарэсах інтэрнацыянальнага пралетарыяту лічыла «неабходным хутчэйшае заключэнне міру без анексій і кантрыбуцый на аснове самавызначэння народаў, насяляючых тэрыторыі, з-за якіх працягваецца спрэчка паміж імперыялістычнымі ўрадамі» [1].

Дэлегаты выказваліся супраць лозунга заключэння «любога міру» Канферэнцыя палічыла неабходным, «каб расійскі пралетарыят рашуча паўплываў на пралетарыят ваюючых дзяржаў, для таго каб зноў быў адноўлены сацыялістычны інтэрнацыянал і сумесна актыўна выступіў за мір на вышэйадзначаных пачатках» [2]. «Пры гэтым, адзначалася ў заключнай частцы канферэнцыі, яўрэйскаму народу павінны быць забяспечаны як грамадзянскія, так і нацыянальныя правы ва ўсіх краінах, у тым ліку і свабода эміграцыі і каланізацыі ў Палесціне» [3].

Некаторую дзейнасць у гады вайны на тэрыторыі беларускіх губерняў ажыццяўлялі і іншыя яўрэйскія групоўкі і арганізацыі. Гэта, у першую чаргу, адносіцца да Гомельскай арганізацыі партыі сіяністаў-сацыялістаў, цэнтр якой знаходзіўся ў Вільні. Аб гэтым сведчыць паведамленне паліцыі, датаванае маем 1915 г.: «Гомельская арганізацыя партыі С.С. атрымлівае кіруючыя ўказанні з ЦК у г. Вільні... дзейнасць Гомельскай арганізацыі абмяжоўваецца продажам сіяністыцкіх марак у агульны сіяністыцкі фонд» [4]. Аднак дзейнасць гэтай партыі вышэйадзначаным, бясспрэчна, не абмяжоўвалася. Арганізацыі сіяністыцка-сацыялістычнай партыі падтрымлівалі сувязі і цесна супрацоўнічалі не толькі з іншымі яўрэйскімі партыямі, але і з Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыяй бальшавікоў, у кіраўніцтве якой было шмат яўрэяў. Аб тым сведчыць паведамленне з матэрыялаў газеты «Новая жизнь»: «Прадстаўляецца бясспрэчным той факт, што шэраг камерцыйных арганізацый, створаных сіяністамі, з 1914 г. фінансіравалі бальшавіцкую партыю. ... Без гэтай падтрымкі апошнім прыйшлося б вельмі цяжка ў ваюючай Расіі» [5, с. 2]. У той жа час патрэбна адзначыць, што частка заможных яўрэяў, з'яўляючыся членамі (СС) і іншых яўрэйскіх партый, аказвала фінансавую дапамогу партыям кадэтаў і акцябрыстаў, больш таго, «спрабуючы абагаціцца, ішла на цесны кантакт з самадзяржаўем, прадстаўляючы яму розныя пазыкі і крэдыты для вядзення вайны» [6, с. 27].

І ўсё ж значная частка фінансаў сіяністаў-сацыялістаў ішла на адукацыйныя патрэбы. Прыкладам гэтаму можа служыць дзейнасць лідскага равіна Ісака Рэйнеса. Лідэр рэлігійных сіяністаў і адзін з распрацоўшчыкаў праграмы пасялення яўрэяў у Палесціне дбаў аб пашырэнні адукацыі сярод яўрэяў і іх годным жыцці на беларускіх землях. Менавіта І. Я. Рэйнес пры фінансавай дапамозе барона Д. Г. Гінцбурга адкрыў у г. Ліда ешыбот (вучылішча), які ў хуткім часе ператварыўся ў шасцігадовую іешыву –

вышэйшую навучальную ўстанову, даволі вядомую ў Беларусі ў пачатку XX ст. У дадзенай навучальнай установе вучылася больш за трыста навучэнцаў, якія асвойвалі Талмуд, яўрэйскую граматыку, гісторыю яўрэйскага народа, некаторыя камерцыйныя дысцыпліны. Іешыва выпускала равінаў, настаўнікаў, купцоў. Аднак смерць І. Рэйнеса ў 1915 г., наступленне кайзераўскіх войск на фронце ў гэты перыяд спынілі вучэбную дзейнасць дадзенай яўрэйскай навучальнай установы [7, с. 14–15].

Даволі моцнымі былі пазіцыі сацыялістаў-сіяністаў і ў выдавецка-інфармацыйнай справе. У Лідзе ў 1914–1915 гг. выпускалі кнігі і газеты дзве друкарні, гаспадарамі якіх з'яўляліся Самуіл Зяльдовіч і Кейля Эпштейн. Адным з цэнтраў сіяніцкага руху быў Магілёў, дзе выдавалася газета «Еврейское слово». У Мінску падчас Першай сусветнай вайны выдаваліся сіяніцкія газеты «Дер ид» («Яўрэй» на ідыш), «Гехавер» (на рускай мове). Апошняя з'яўлялася органам аднайменнай сіяніцкай студэнцкай арганізацыі [8, с. 16].

Увогуле, Беларусь з'яўлялася цэнтрам руху яўрэйскай моладзі сацыялістычнага кірунку, кшталту «Цеирей Цион» («Моладзь Сіёна»). Менавіта ў Мінску ў 1912 г. адбылася першая агульнарасійская канферэнцыя гэтай арганізацыі. У пачатку вайны штабкватэра «Цеирей Цион» знаходзілася ў Беластоку, дзе кіраўніцтвам гэтай арганізацыі ўзнімалася пытанне аб стварэнні яўрэйскай сацыялістычнай дзяржавы ў Палесціне, «фарміраванні нацыянальна-персанальнай аўтаноміі і яўрэйскай адукацыі на іўрыце» ў Расійскай імперыі. Акрамя таго, у гады вайны, знаходзячыся на нелегальным становішчы, дадзеная арганізацыя адыграла значную ролю ў стварэнні сіяніцкага міжпартыйнага аб'яднання «Гехалуц» і ў арганізацыі антыпагромных сіл яўрэйскай самаабароны [9, с. 16].

Ёсць звесткі, што ў гады вайны ў Беларусі праводзіла пэўную работу Сацыялістычная яўрэйская рабочая партыя (Сярп) [6, с. 24]. Разумеючы, што ў бліжайшы час нельга дамагчыся асабістай тэрыторыі для яўрэяў, дадзеная партыя на чале з Хаімам Жытлоўскім бачыла рэальнае вырашэнне яўрэйскага пытання ў пераўтварэнні Расійскай імперыі ў федэратыўную дзяржаву розных нацыянальнасцей. Меркавалася, што кожная з нацыянальнасцей, у тым ліку і яўрэйская, павінны мець свой нацыянальны сойм. Сойм павінен быў стаць вышэйшай інстанцыяй і ажыццяўляць кіраўніцтва ва ўсіх сферах жыццядзейнасці нацыі, а таксама выконваць галоўныя функцыі падчас ваеннага становішча. Аднак часта разрозненыя арганізацыі і групы гэтай партыі імкнуліся весці ў асноўным культурную і дабрачынную працу сярод рабочых-яўрэяў, прадстаўнікоў яўрэскай дробнай і сярэдняй буржуазіі, а таксама ў асяроддзі яўрэйскага бежанскага насельніцтва. Але значнага поспеху ў сваёй рабоце ў ваенны час гэтыя арганізацыі не мелі, прыбавіўшы ў свае шэрагі толькі асобных рабочых і нязначную частку інтэлігенцыі.

Акрамя таго, вядома, што калі па ініцыятыве беларускіх арганізацый у канцы 1915 г. у Вільні была створана «Канфедэрацыя Вялікага княства Літоўскага», абвясціўшая неабходнасць «адраджэння гістарычнай Літвы» і дасягнення незалежнасці вышэйадзначанай дзяржавы, то актыўны ўдзел у рабоце гэтага органа прымалі разам з іншымі нацыянальнасцямі краю і мясцовыя яўрэйскія арганізацыі [10, с. 28].

Напярэдадні і ў час Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. вялікае значэнне ўсе яўрэйскія партыйныя арганізацыі надавалі рабоце ў прафесійных саюзах. Адзін з лідэраў яўрэйскага руху ў гэты перыяд Я. Левін у артыкуле «Аб прафсаюзах» пісаў наступнае: «Мы, яўрэйскія рабочыя, якія пачалі эканамічную барацьбу 25 гадоў назад і ведучы гэтую барацьбу ў часы рэакцыі, не спыняліся не перад якімі ахвярамі, мы павінны ў сённяшняй Расіі ўзяцца з найвялікшай энергіяй за стварэнне і замацаванне нашых прафесійных арганізацый» [11]. Як паведамлялася ў газеце «Веккор», толькі ў Мінску ў пачатку 1917 г. налічвалася больш за дзесяць прафесійных саюзаў, кіраўніцтва якімі ажыццяўлялі сіяністы-сацыялісты, яшчэ 16 прафесійных саюзаў знаходзілася пад уплывам паалей-цыяністаў. Сярод найбольш вядомых прафсаюзаў былі арганізацыі друкароў, цырульнікаў, булачнікаў, гарбароў і інш. [16, с. 25].

Падчас Лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі 1917 г. адбылося хуткае ажыўленне дзейнасці ўсяго яўрэйскага нацыянальнага руху на беларускіх землях. Назіраўся імклівы рост шэрагаў раней існаваўшых, а таксама зноўстворанных яўрэйскіх партыйных арганізацый. Напрыклад, толькі ў Мінску Бунд налічваў 1 тысячу членаў, прыкладна такую ж колькасць членаў мела ў сваіх шэрагах мінская «Паалей-Цыён», 1432 з іх адносіліся да арганізацыі «Макабі», якая дзейнічала на Гомельшчыне і г. д. [16, с. 25].

Што ж датычыцца ў цэлым яўрэйскага руху ў Беларусі да Лютаўскай рэвалюцыі, то ён, як бачым, меў адну агульную акалічнасць – усе партыі, без выключэння, насілі сацыялістычны характар. Гэта хутчэй за ўсё тлумачыцца тым, што яўрэі традыцыйна адчувалі сябе людзьмі другога сорту. Рыса аселасці, забарона на карыстанне роднай мовай, на заняткі земляробствам, абвінавачванне ў шпіёнстве і спекуляцыях, пагромы, ганенні, высялененні выклікалі

справядлівае незадавальненне бяздумнымі абмежаваннямі і вялі да барацьбы за знішчэнне ўсёй існуючай сістэмы. Менавіта гэта падштурхоўвала яўрэяў да радыкальных пераўтварэнняў, якія былі на ўзбраенні толькі партый сацыялістычнага накірунку.

З пачаткам вайны і ўвядзеннем ваеннага становішча ў беларускіх губернях яўрэйскія нацыянальныя арганізацыі з мэтай легалізацыі засяродзілі сваю дзейнасць у розных дабрачынных установах, створаных у сувязі з вайной, аказваючы дапамогу высяленцам, бежанцам, беспрацоўным.

Аналіз дзейнасці яўрэйскіх партый і арганізацый на беларускіх землях сведчыць, што яна насіла падчас Першай сусветнай вайны шматгранны і супярэчлівы характар. Адзінай стратэгіі, тактыкі, мэт і задач у яўрэйскага нацыянальнага руху не было. У сваёй большасці тыя партыйныя арганізацыі, якія аказаліся ў выніку вайны пад акупацыяй, рабілі стаўку на германскі блок дзяржаў. Тыя ж партыйныя арганізацыі, што знаходзіліся на неакупіраванай тэрыторыі, схіляліся да падтрымкі Расіі, карэкцыруючы сваю грамадска-палітычную дзейнасць у залежнасці ад ваенных абставін і становішча ў гэтай краіне. У выніку, асобныя групоўкі, партыйныя арганізацыі яўрэяў падчас вайны значна ўплывалі на грамадска-палітычнае жыццё ў нашым краі, чаму садзейнічала спецыфіка невялікіх беларускіх гарадоў і мястэчак, дзе пражывала і працавала асноўная маса яўрэйскіх рабочых, рамеснікаў, люмпен-інтэлігентаў.

Заможныя прадстаўнікі яўрэйскага насельніцтва, якія займалі ключавыя пазіцыі ў прамысловасці, гандлі, банкаўскай справе, нягледзячы на сваё членства ў розных яўрэйскіх партыях, часта ў супрацьлегласць агульным партыйным інтарэсам, вялі супрацоўніцтва і фінансавалі расійскія буржуазныя і сацыял-дэмакратычныя партыі. Яны падтрымлівалі ваенна-прамысловыя камітэты, розныя абарончыя мерапрыемствы, тым самым мелі цесны кантакт з дзяржаўнымі структурамі.

І ўсё ж, нягледзячы на разгалінаванасць падыходаў і супярэчлівы характар яўрэйскага руху на беларускіх землях падчас Першай сусветнай вайны, нельга не адзначыць, што ён адыгрываў значную ролю і быў істотнай рухаючай сілай як у грамадскім, так і ў палітычным жыцці беларускага краю ў ваенны перыяд.

*Літаратура і крыніцы*


1. НАРБ. – Ф. 60. – Воп. 3. С. 73. Л. 33.
2. Там жа.
3. Там жа.
4. НАРБ. – Ф. 60. – Воп. 3. – С. 113. – Л. 24.
5. ИМА-пресс по материалам газеты «Новая жизнь». Всё гораздо сложнее... Евреи, сионизм и революция в России // Знамя юности. – 1990. – 21 сент.
6. *Шчаўлінскі, М.Б.* Нацыянальная палітыка Бунда і іншых яўрэйскіх арганізацый на Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны (1914–1918 гг.) / М.Б. Шчаўлінскі // Гуманітарна-эканамічны веснік. – 1996. – № 3.
7. *Сливкин, В.* Мир еврейских местечек. Лида / В. Сливкин // АВИВ. 2003. январь – февраль.
8. *Басин, Я.* По тропам истории. Разгром сионистского движения в советской Белоруссии // АВИВ. 2003. Июнь–июль.
9. Там жа.
10. *Турук, Ф.* Белорусское движение. Очерк национального и революционного движения белорусов / Ф. Турук. – М.: Госиздат, 1921. – 145 с.
11. НАРБ. – Ф. 60. Воп. 3. – С. 73. – Л. 27.



*Summary*

*The trends of social-political activities of some Sewish organizations during World War I are being researched. The character of their activities on Belarusian territory is being analyzed.*